Aleksandr P. Shevlyukov, Grand PhD in Economic Sciences, Professor, Head of the Department of Accounting and Financial Management in in Industries of the National Economy of the Institution of Education “Belarusian Trade and Economic University of Consumer Cooperatives” (Homieĺ, Republic of Belarus).

Nikolay S. Yakovchik, Grand PhD in Economic Sciences, Grand PhD in Agriculture, Professor, Director of the Institute for Advanced Training and Retraining of the Institution of Education “Belarusian State Agrarian Technical University” (Minsk, Republic of Belarus).

*Editorial address:*
21 Voykova Str., 225404 Baranovichi.
Phone: +375 163 64 34 77.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Subscription indixes:* 00993 — for individual subscribers; 009932 — for companies.

The certificate of the registration of mass media № 1533 of 30.07.2012 issued by the Ministry of Information of Belarus.

*In accordance with the order of the board of the Higher Attestation Commission of the Republic of Belarus on January 21, 2015 № 16 the scientific-and-practical journal “BarSU Herald”, the series “History of science and archaeology. Economics. Laws” was included on the list of the scientific publications of the Republic of Belarus for publishing the results of dissertation research History of science and archaeology, Economics, Laws.*

*Scientific-and-practical journal “BarSU Herald” is included into RSCI (Russian Science Citation Index), license agreement № 06-01/2016.*

*Published:* educational institution “Baranovichi State University”.

Issued in Russian, Belarusian and English.

The journal is distributed on the territory of the Republic of Belarus.

---

*Managing editor* A. Y. Sidorenko
*Technical editor* L. N. Scherbuk
*Desktop Publishing* S. M. Glushak
*Proofreader* N. N. Kolodko

Signed to print 17.12.2020. Format 60 × 84 $^{1}/_{8}$. Ofset paper. Digital printing. Headset Times. Cond. print. 28,00. Acc.-pub. l. 24,10. Circulation: 100 copies. Order .

Free price.

Printing performance: Grodno Regional Printing Unitary Enterprise “Slonim printing establishment”. The state registration certificate of the publisher, manufacturer and publications distributor № 1/203 of 07.03.2014, № 2 of 25.02.2014.

Address: 16 Hlyupin Str., 231800 Slonim, Grodno region.

© BarSU, 2020

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Булаты П. Ю.** Отношения Ходкевичей и дворянина Свидерского по делу о заставе двора Павлюковщина (1590) . . . 13
**Ганчар А. И.** Реформирование римско-католических духовных консисторий в Российской империи . . . 18
**Колтаченко А. И.** Методологические аспекты изучения образовательных путешествий XVI—XVIII веков на примере образования Якуба Собеского . . . 27
**Концевой П. А.** Некоторые особенности демонтажных мероприятий в советской зоне оккупации Германии и Австрии (1945—1948) . . . 32
**Котусев Е. Н.** Проблематика отношений германского мира и славянства в XIII—XVI веках в творчестве Н. Н. Любовича . . . 37
**Кривуть В. И.** Марш «Свитязянский шлях»: из истории развития спорта в Барановичском повете в межвоенный период . . . 50
**Кручковский Т. Т., Котусев Е. Н.** Основная проблематика российской политики в Центральной Европе в первой трети XIX века в оценке русской исторической науки второй половины XIX — начала XX века (на примере Герцогства Варшавского и Царства Польского) . . . 55
**Лишик В. В.** Деятельность рода Урсын-Немцевичей на территории Беларуси во второй половине XVIII века . . . 71
**Скорб М. Г.** Российская и австрийская модели автономизации белградского пашалыка на начальном этапе Первого сербского восстания (1804—1806) . . . 77
**Спиридонова Т. А.** Действия уполномоченных Совета по делам Русской православной церкви при Совете Министров БССР в соответствии с постановлением Совета Министров СССР от 16 марта 1961 года (1961—1965) . . . 82
**Стурейко Н. А.** Роль государственных праздников в формировании гражданского общества в Республике Беларусь . . . 88


### ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Куньпэн Х.** Институциональные рамки и план активного участия Китая в деятельности Всемирной организации здравоохранения . . . 94
**Безуглая В. А., Костюкевич Е. А.** Компетентностная модель образования 3.0: мировой и отечественный опыт . . . 101
**Зазерская В. В.** Социальные аспекты развития интеллектуального потенциала в экономике знаний . . . 106
**Климук В. В.** Факторы активизации инновационного развития промышленных предприятий в условиях пандемии и в постпандемический период . . . 113
**Климук В. В., Климук Е. В.** Развитие методики оценки уровня инновационного развития промышленного сектора экономики в стратегии неоиндустриализации . . . 120
**Курбеко Н. А.** Теоретические аспекты трактовки сущности реального сектора экономики . . . 128
**Лизакова Р. А.** Внедрение принципов маркетинга взаимодействия в бизнес-процессы отечественных предприятий . . . 133
**Наранович О. И., Горбач Ю. Е., Ермакова А. А.** Разработка имитационной модели решения оптимизационной задачи с учетом ограниченности ресурсов . . . 138
**Платоненко Е. И., Рутман Е. Я.** Система маркетинга образовательных услуг учреждения образования «Барановичский государственный университет» . . . 148
**Тозик М. В.** Основные проблемы в деятельности небанковских финансовых организаций в условиях макроэкономической стабилизации в Республике Беларусь (1996—2001) . . . 154
**Трич Ю. А.** Управление отходами стекла как элемент ресурсосберегающей деятельности . . . 159
**Харкевич И. С.** Использование социологических инструментов для оценки факторов, влияющих на инновационное развитие предприятий Республики Беларусь . . . 164


### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Василевич Г. А.** Комплексный подход к противодействию коррупции — залог успеха . . . 170
**Горбатова М. А.** Группа лиц по предварительному сговору: некоторые вопросы теории и практики . . . 181
**Дзик И. Р.** Система и классификация гражданско-правовых договоров в сфере профессионального спорта . . . 185
**Кирмель А. Г.** Семейно-правовые последствия изменения половой принадлежности лиц, состоящих в браке . . . 190
**Петровский Н. А.** Государственно-управленческий концепт в современных условиях развития Республики Беларусь . . . 194
**Резюк В. И.** Уголовная ответственность за злоупотребление властью или служебными полномочиями, совершенное должностным лицом при разгосударствлении, приватизации государственной собственности: становление и развитие, особенности современного состояния . . . 198
**Рузанова В. Д.** Проблемы формирования информационного законодательства в аспекте теории систем . . . 204
**Рутман Е. Я.** Правовой статус несовершеннолетнего: некоторые межотраслевые аспекты . . . 209
**Скок О. И., Шуленкова И. В.** Уголовно-правовая трактовка особой жестокости в составе убийства . . . 215
**Соловьёв П. В.** Реализация принципа конституционности на стадиях планирования нормотворческой деятельности и нормотворческой инициативы . . . 219


Репозиторий БарГУ

## ЗМЕСТ

### ГІСТАРЫЧНЫЯ НАВУКІ


**Булаты П. Ю.** Адносіны Хадкевічаў і шляхціца Свядэрскага ў справе заставы двара Паўлюкоўшчына (1590) . . . . . . 13

**Ганчар А. І.** Рэфармаванне рымска-каталіцкіх духоўных кансісторый у Расійскай імперы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

**Калтачэнка А. І.** Метадалагічныя аспекты вывучэння адукацыйных падарожжаў XVI—XVIII стагоддзяў на прыкладзе адукацыі Якуба Сабескага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**Канцавы П. А.** Некаторыя асаблівасці дэмантажных мерапрыемстваў у савецкай зоне акупацыі Германіі і Аўстрыі (1945—1948) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

**Котусеў Я. М.** Праблематыка адносін германскага свету і славянства ў XIII—XVI стагоддзях ў творчасці М. М. Любовіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

**Крывуць В. І.** Марш «Свіцязянскі шлях»: з гісторыі развіцця спорту ў Баранавіцкім павеце ў міжваенны перыяд . . . 50

Кручкоўскі Т. Т., Котусеў Я. М. Асноўная праблематыка расійскай палітыкі ў Цэнтральнай Еўропе ў першай трэці XIX стагоддзя ў ацэнцы рускай гістарычнай навукі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя (на прыкладзе Герцагства Варшаўскага і Царства Польскага) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

**Лішык У. В.** Дзейнасць роду Урсын-Нямцэвічаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII стагоддзя . . . . . . . . . 71

**Скорб М. Г.** Расійская і аўстрыйская мадэлі аўтанамізацыі бялградскага пашалыка на пачатковым этапе Першага сербскага паўстання (1804—1806) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77

**Спірыдонава Т. А.** Дзеянні ўпаўнаважаных Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры Савеце Міністраў БССР у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 16 сакавіка 1961 года (1961—1965) . . . . . . . . . . . . . . 82

**Стурэйка М. А.** Роля дзяржаўных святаў у фарміраванні грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь . . . . . . . 88


### ЭКАНАМІЧНЫЯ НАВУКІ


**Куньпэн Х.** Інстытуцыйныя рамкі і план актыўнага ўдзелу Кітая ў дзейнасці Сусветнай арганізацыі аховы здароўя . . . . 94

**Бязуглая В. А., Касцюкевіч А. А.** Кампетэнтнасная мадэль адукацыі 3.0: сусветны і айчынны вопыт . . . . . . . . . . . . . 101

**Зазерская В. В.** Сацыяльныя аспекты развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу ў эканоміцы ведаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106

**Клімук У. У.** Фактары актывізацыі інавацыйнага развіцця прамысловых прадпрыемстваў ва ўмовах пандэміі і ў постпандэмічны перыяд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113

**Клімук У. У., Клімук Я. В.** Развіццё методыкі ацэнкі ўзроўню інавацыйнага развіцця прамысловага сектара эканомікі ў стратэгіі неаіндустрыялізацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120

**Курбека Н. А.** Тэарэтычныя аспекты трактоўкі сутнасці рэальнага сектара эканомікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128

**Лізакова Р. А.** Укараненне прынцыпаў маркетынгу ўзаемадзеяння ў бізнес-працэсы айчынных прадпрыемстваў . . . 133

**Нарановіч А. І., Горбач Ю. Я., Ермакова Г. А.** Распрацоўка імітацыйнай мадэлі рашэння аптымізацыйнай задачы з улікам абмежаванасці рэсурсаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138

**Платоненка А. І., Рутман А. Я.** Сістэма маркетынгу адукацыйных паслуг установы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148

**Тозік М. В.** Асноўныя праблемы ў дзейнасці нябанкаўскіх фінансавых арганізацый ва ўмовах макраэканамічнай стабілізацыі (1996—2001) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154

**Трыч Ю. А.** Упраўленне адходамі шкла як элемент рэсурсазберагальнай дзейнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159

**Харкевіч І. С.** Выкарыстанне сацыялагічных інструментаў для ацэнкі фактараў, якія ўплываюць на інавацыйнае развіццё Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164


### ЮРЫДЫЧНЫЯ НАВУКІ


**Васілевіч Г. А.** Комплексны падыход да процідзеяння карупцыі — залог поспеху . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170

**Гарбатава М. А.** Група асоб па папярэдняй змове: некаторыя пытанні тэорыі і практыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181

**Дзік І. Р.** Сістэма і класіфікацыя грамадзянска-прававых дагавораў у сферы прафесійнага спорту . . . . . . . . . . . . . . . . 185

**Кірмель А. Г.** Сямейна-прававыя наступствы змены палавой прыналежнасці асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе . . . . . . 190

**Пятроўскі М. А.** Дзяржаўна-кіраўнічы канцэпт у сучасных умовах развіцця Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 194

**Рэзюк В. І.** Крымінальная адказнасць за злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі, здзейсненае службовай асобай пры раздзяржаўленні, прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці: станаўленне і развіццё, асаблівасці сучаснага стану . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198

**Рузанава В. Д.** Праблемы фарміравання інфармацыйнага заканадаўства ў аспекце тэорыі сістэм . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

**Рутман А. Я.** Прававы статус непаўналетняга: некаторыя міжгаліновыя аспекты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209

**Скок А. І., Шулянкова І. В.** Крымінальна-прававая трактоўка асаблівай жорсткасці ў складзе забойства . . . . . . . . . . 215

**Салаўёў П. В.** Рэалізацыя прынцыпу канстытуцыйнасці на стадыях планавання нарматворчай дзейнасці і нарматворчай ініцыятывы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219


Репозиторий БарГУ

CONTENTS

## HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY


**Bulaty P. Yu.** The relations between the Hadkievičs and the nobleman Sviaderski in the case of the leasing of Paŭliukoŭščyna estate (1590) . . . 13
**Hanchar A. I.** Reformation of Roman catholic ecclesiastical consistories in the Russian empire . . . 18
**Kaltachenka A. I.** Methodological aspects of the study of educational travel XVI—XVIII centuries on the example of the education of Jakub Sobieski . . . 27
**Kantsavoi P. A.** Some features of dismantling measures in the soviet zone of occupation of Germany and Austria (1945—1948) . . 32
**Kotusev E. N.** The problematics of the relations of the german peace and the slavery in the XIII—XVI centuries in the works of N. N. Lyubovich . . . 37
**Krivut V. I.** March "Svityazyanskiy shlyakh": from the history of sport development in the Baranovichi region in the interwar period . . . 50
**Kruchkovsky T. T., Kotusev E. N.** The main problems of russia's policy in Central Europe in the first third of the XIX century in the assessment of russian historical science in the second half of the XIX — early XX century (on the example of the Duchy of Warsaw and the Kingdom of Poland) . . . 55
**Lishyk V. V.** The family of Ursyn-Nemtsevich in the territory of Belarus in the second half of the XVIII century . . . 71
**Skorb M. G.** Russian and Austrian models of autonomy of the pashalik of Belgrade at the initial stage of the First serbian uprising (1804—1806) . . . 77
**Spiridonova T. A.** Actions of the commissioners of the Council for the affairs of Russian orthodox church under the Council of Ministers the BSSR in accordance with the resolution of the Council of Ministers of the USSR of march 16, 1961 (1961—1965) . . 82
**Stureiko N. A.** The role of public holidays in the formation of civil society in the Republic of Belarus . . . 88


## ECONOMICS


**Kunpeng H.** Institutional framework and plan for China's active participation in the activities of the world health organization . . . 94
**Bezuglaya V. A., Kostyukevich E. A.** Competence education model 3.0: world and domestic experience . . . 101
**Zazerskaya V. V.** social aspects of intellectual potential development in the knowledge economy . . . 106
**Klimuk V. V.** Redictors of effective collaboration of the educational, scientific and business sectors in terms of digital economy . . . 113
**Klimuk V. V., Klimuk E. V.** Development of the methodology for assessing the level of innovative development of the industrial sector of the economy in the strategy of neo-industrialization . . . 120
**Kurbeka N. A.** Theoretical aspects of the interpretation of the essence of the real sector of the economy . . . 128
**Lizakova R. A.** Implementation of interaction marketing principles in the business processes of domestic enterprises . . . . . 133
**Naranovich O. I., Gorbach Y. E., Ermakova A. A.** Development of a simulation model for the solution of an optimization problem taking into account the restriction of resources . . . 138
**Platonenko E. I., Rutman E. Y.** Marketing system for educational services in the educational institution "Baranovichi State University" . . . 148
**Tozik M. V.** The main problems in the activities of non-bank financial institutions in the context of macroeconomic stabilization in Belarus (1996—2001) . . . 154
**Trych Yu. A.** Glass waste management as an element of resource-saving activities . . . 159
**Kharkevich I. S.** Use of sociological instruments for the estimation of factors, influencing innovative development of the enterprises of the Republic of Belarus . . . 164


## LAW


**Vasilevich G. A.** An integrated approach to anti-corruption — a success for success . . . 170
**Gorbatova M. A.** A group of persons by prior collusion: some issues of theory and practice . . . 181
**Dzik I. R.** System and classification of civil contracts in the field of professional sports . . . 185
**Kirmel A. G.** Family and legal consequences of changing the gender of married persons . . . 190
**Piatrouski N. A.** State management concept in modern conditions of the development of the Republic of Belarus . . . 194
**Rezyuk V. I.** Criminal liability for the abuse of power or official authority committed by an official during the denationalization and privatization of state property: formation, development, features of the current state . . . 198
**Ruzanova V. D.** Problems of the formation of the information legislation in the aspect of the systems theory . . . 204
**Rutman E. Y.** Legal status of a juvenile: some cross-sectoral aspects . . . 209
**Skok O. I., Shulenkova I. V.** Criminal law interpretation of special cruelty in murder . . . 215
**Soloviev P. V.** Implementation of the principle of constitutionality at the stages of planning rule-making activity and rule-making initiative . . . 219


Репозиторий БарГУ

УДК 94(474/476)"15/17":338.482:37

**А. І. Калтачэнка**
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Рэспубліканскі інстутыт вышэйшай школы»,
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Маскоўская, 15, 220007 Мінск, Рэспубліка Беларусь,
+375 (29) 270 62 11, koltachenkoalina@gmail.com

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАДАРОЖЖАЎ XVI—XVIII СТАГОДДЗЯЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ АДУКАЦЫІ ЯКУБА САБЕСКАГА

У артыкуле аналізуюцца метады гістарычных даследаванняў, найбольш прыдатныя для вывучэння адукацыйных падарожжаў шляхты XVI—XVIII стагоддзяў на прыкладзе выхаваўчых інструкцый і дыярыуша падарожжа Якуба Сабескага — дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, бацькі караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага. Асноўная ўвага надаецца спецыяльна-гістарычным і міждысцыплінарным метадам, сярод якіх разглядаюцца наратыўны, гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны метады і кантэнт-аналіз. Ужываючы названыя метады, разгледзілі замежную адукацыю Якуба Сабескага, яе геаграфію, асаблівасці і ўплыў на кар'еру шляхціца.

**Ключавыя словы:** метады гістарычнага даследавання; Якуб Сабескі; замежная адукацыя; наратыўныя крыніцы; дыярыуш.
Бібліягр.: 17 назв.

**A. I. Kaltachenka**
State Educational Institution "Republican Institute of Higher Education", Ministry of Education of the Republic of Belarus,
15 Moscowskaya St., 220007 Minsk, Republic of Belarus, +375 (29) 270 62 11, koltachenkoalina@gmail.com

# METHODOLOGICAL ASPECTS OF THE STUDY OF EDUCATIONAL TRAVELLINGS IN THE XVI—XVIII CENTURIES ON THE EXAMPLE OF THE EDUCATION OF JAKUB SOBIESKI

The article analyzes the methods of historical research that are most suitable for studying the educational travels of the nobility of the 16th—18th centuries on the example of the preserved teaching instructions and the travel diary of Jakub Sobieski — statesman and military leader of the Polish-Lithuanian Commonwealth, father of the King of the Polish-Lithuanian Commonwealth Jan III Sobieski. The main attention is paid to special historical and interdisciplinary methods, including narrative, historical genetic, historical comparative methods and content analysis. With the help of these methods, the foreign education of Jakub Sobieski, his geography, features and influence on the career of a nobleman are examined.

**Key words:** methods of historical research; Jakub Sobieski; foreign education; narrative sources; diary.
Ref.: 17 titles.

**Уводзіны.** Сучасны этап развіцця беларускай гістарычнай навукі характарызуецца павышанай цікавасцю не толькі да палітычнай ці эканамічнай гісторыі, але і да вывучэння гісторыі культурнага і прыватнага жыцця, у тым ліку да адукацыі. Беларускія гісторыкі распрацоўваюць у гэтым напрамку такія тэмы, як гісторыя этыка-педагагічнай думкі [1], этнаканфесійныя і сацыяльныя асаблівасці адукацыі ў розныя гістарычныя перыяды [2], роля манаскіх ордэнаў у гісторыі асветы [3]. Тэма замежнай адукацыі шляхты і магнатаў, геаграфія і асаблівасці адукацыйных падарожжаў таксама ўяўляюць цікавасць, але разглядаліся толькі асобныя прыклады гэтай з'явы [4; 5].

**Метадалогія і метады даследавання.** Даследаванні замежнай адукацыі вядуцца па такіх архіўных дакументах, як дыярыушы, прыватныя лісты маладых людзей да дому ці сябрам, справаздачы суправаджаючых дарослых гувернёраў ці слуг, адукацыйныя інструкцыі да выхавацеляў і саміх падарожнікаў, тэстаменты і г. д. Праца з такім тыпам дакументаў патрабуе выкарыстання спецыяльных метадаў, якія дазволяць апрацаваць матэрыял найбольш якасна. Таму мэтай артыкула з'яўляецца аналіз тэарэтыка-метадалагічнай базы для пошуку метадаў, прыдатных пры даследаванні адукацыйных падарожжаў шляхты XVI—XVIII стагоддзяў на прыкладзе дыярыуша Якуба Сабескага (1591—1646) — дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, бацькі караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Вывучэнне дыярыушаў, лістоў, інструкцый і іншых наратыўных крыніц мае пэўныя метадалагічныя асаблівасці. Даследчык можа аналізаваць інфармацыю толькі відавочную або вывучаць латэнтны, схаваны змест. Але якую б стратэгію вывучэння зместу

© Калтачэнка А. І., 2020

Рэпазіторый БарДУ

не выбраў гісторык, ён павінен здзейсніць адбор інфармацыі з наратыўных крыніц, зрабіць адпаведныя высновы, тэарэтычныя абагульненні.

У дадзеным артыкуле разгледзім метадалогію вывучэння замежных падарожжаў з мэтай адукацыі на прыкладзе дыярыуша Якуба Сабескага, які пісаўся падчас падарожжаў 1607—1613 і 1638 гадоў [6]. Пры неабходнасці звернемся да інструкцыі Якуба Сабескага пану Архоўскаму, які суправаджаў сыноў Якуба (будучага караля Яна III і Марэка Сабескіх) у адукацыйных падарожжах [7], і інструкцыі Якуба Сабескага, напісанай сваім сынам перад іх падарожжам у Францыю (1645) [8]. Гэтыя дакументы — выдатнае адлюстраванне праграмы навучання маладых дваран у XVII стагоддзі. Якуб Сабескі ў сваіх дыярыушах апісвае ўражанні і прыгоды падчас знаходжання ў Еўропе, а ў інструкцыях тлумачыць, чаму неабходна набываць веды і якія вобласці навукі варта паглыбляць, дае парады па арганізацыі дня, акцэнтуе ўвагу на неабходнасці чытання якасных кніг і нават прыкладае спіс для чытання, раіць, як бавіць вольны час.

Важна адзначыць, што ў Якуба Сабескага была звычка апісваць на паперы ўсе важныя падзеі свайго жыцця. Такім чынам, пасля яго засталася добрая пісьмовая спадчына, у якую ўваходзяць вялікая колькасць лістоў, некалькі дыярыушаў, розныя інструкцыі і каментары. Акрамя ўжо названых дакументаў ён напісаў дыярыуш маскоўскай кампаніі каралевіча Уладзіслава Вазы ў 1617 годзе, які не быў апублікаваны пры жыцці Якуба з-за рэакцыі на яго Жыгімонта III [8, с. 8]. У 1621 годзе быў напісаны і ў 1646-м апублікаваны “Commentariorum Chotinensis belli libri tres” — дыярыуш бітвы пад Хацінам [9, с. 484], які мае высокую гістарычную каштоўнасць. У 1633 годзе Якуб Сабескі напісаў дыярыуш каранацыйнага сойма ў Кракаве, які быў апублікаваны ў 2008 годзе [10]. Такім чынам, пісьмовая спадчына Якуба Сабескага дазваляе нам сфарміраваць даволі поўны партрэт жыцця шляхціца XVII стагоддзя.

**Аналіз метадаў даследавання.** У сучасных гістарычных даследаваннях выкарыстоўваюць вялікую колькасць метадаў: метады лагічнага пазнання, агульнанавуковыя, спецыяльна-гістарычныя і міждысцыплінарныя, але не кожны з іх падыходзіць для працы з наратыўнымі крыніцамі. Далей прааналізуем некалькі метадаў, якія будуць карыснымі пры вывучэнні падарожжаў з мэтай замежнай адукацыі.

*Наратыўны, ці апісальна-апавядальны, метад* прадугледжвае збор звестак у архівах і іх мантаж у адзінае апавяданне. Расказ павінен адпавядаць логіцы саміх падзей, а гісторык інтэрпрэтуе дадзены ланцуг, зыходзячы з пэўных прычынна-выніковых сувязяў, устаноўленых фактаў [11, с. 387]. Зробім мантаж гісторыі адукацыі Якуба Сабескага.

Якуб Сабескі (1590—1646) каля 1604 года быў адпраўлены ў школу Кракаўскай акадэміі, праз год пераехаў у Замойскую акадэмію, дзе вучыўся да канца 1606 года [9, с. 483]. У 1607 годзе з’ехаў у Парыж, дзе знаходзіўся да 1611 года. Першыя два гады вучыўся прыватна ў Ісаака Касабона, гуманіста і філолага, астатнія два гады — у Каралеўскім калегіуме (Collège Royal). За гэты час вывучыў французскую, іспанскую, італьянскую, лацінскую мовы і прайшоў курс гуманітарных навук. Знаёміўся з жыццём Францыі — наведваў двор французскага караля Генрыха IV, прысутнічаў пры яго пахаванні і каранацыі Людовіка XIII. У гэтыя ж гады здзяйсняў розныя падарожжы. Так, у 1609 годзе наведаў Англію, Нідэрланды, Галандыю, Герцагства Брабант, нямецкія землі. У 1610 годзе падарожнічаў па Францыі. Пасля заканчэння навучання здзейсніў падарожжа па Іспаніі і Партугаліі, у 1612-м доўгі час заставаўся ў Рыме і адтуль выязджаў да найбольш буйных італьянскіх гарадоў. У сярэдзіне 1612 года рушыў дамоў, па дарозе наведаў італьянскія Ларэту, Балонню, Ферару, Венецыю, аўстрыйскія Карынтыю і Штырыю. На некалькі тыдняў затрымаўся ў Вене для знаёмства з дваром імператара Маціяса I. Дадому вярнуўся ў 1613 годзе [7, с. 3—4].

Такое сціслае апісанне падарожжа Якуба Сабескага важна для першаснага аналізу гістарычнай з’явы. Але для глыбокага пранікнення ў сутнасць падзей гэтага, відавочна, недастаткова, трэба выкарыстоўваць іншыя метады, якія дазваляюць праводзіць больш глыбокі аналіз інфармацыі.

*Гісторыка-генетычны метад* — вывучэнне паходжання і развіцця розных гістарычных з’яў. Мэта — выяўленне асаблівасцей развіцця, аналіз прычын і наступстваў, тлумачэнне фактаў [12, с. 153]. Гісторыка-генетычны метад з’яўляецца адным з асноўных пры вывучэнні адукацыйных падарожжаў шляхты, бо дазволіць прасачыць генезіс адукацыйных замежных падарожжаў, вызначыць асаблівасці геаграфіі такіх падарожжаў, уплыў канфесіянальных адрозненняў сям’і на выбар універсітэта і г. д.

Калі разглядаць прыклад адукацыйнага падарожжа аднаго чалавека, дадзены метад можна прымяніць для аналізу таго, наколькі тыпічным было падарожжа Якуба Сабескага для свайго часу, ці пра-

Рэпазіторый БарГУ

сачыць, як з’ява замежных адукацыйных падарожжаў мянялася ў часе, як адрознівалася адукацыя продкаў і нашчадкаў Якуба Сабескага. Фармат і тэма артыкула не дазваляюць правесці поўны аналіз з’явы адукацыйных замежных падарожжаў, таму разгледзім падабенства і адрозненне адукацыі Сабескіх ад прынятых у той час падарожжаў, бо іх адукацыя была не зусім тыпічна для свайго часу.

Па-першае, да сярэдзіны XVII стагоддзя сярод шляхты і магнатаў Рэчы Паспалітай былі распаўсюджаны акадэмічныя паездкі, так званыя перэгрынацыі (peregrinatio academica), якія не прадугледжвалі турыстычнага аспекту ў падарожжах [13]. Толькі з другой паловы XVII стагоддзя пачынае звяртацца ўвага на пазнавальны аспект падарожжаў. Па запісам Якуба бачна, што ён апярэдзіў час. Вось, напрыклад, што піша Якуб пра Арлеан: “…idzie pod niém rzeka sławna we Francyi, Loire, na niéj jest piękny most murowany, miasto wesołe, piękne, kościoły w niém piękne, ale bardzo zrujnowane przez Hugenotów…” [6, с. 92].

Акрамя таго, незвычайным для свайго часу выглядае і выбар месца навучання Якуба і яго сыноў. З Кракаўскай акадэміяй зразумела — да ўзнікнення Віленскай акадэміі гэта быў адзіны вялікі адукацыйны цэнтр у краіне. А вось выбар Парыжу прадстаўляе цікавасць. У першай палове XVII стагоддзя найбольш папулярныя і дарагія цэнтры адукацыі знаходзіліся ў нямецкіх і галандскіх землях. Адным з самых папулярных быў Страсбург, які, нягледзячы на вялізныя кошты, прываблiваў прадстаўнікоў Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага [14, с. 12].

Парыж жа вабіў сваёй рыцарскай школай, у якой рыхтавалі да будучай службы ў арміі. Улічваючы, што кожны шляхціц быў абавязаны служыць, зразумела, што рыцарскія школы давалі карысныя веды. У іх вучылі фехтаванню, верхавой яздзе, ваеннай інжынерыі, сучасным мовам. Класічныя мовы, права, тэалогія і іншыя навукі давалі ў скарочаным выглядзе. Тым цікавей выглядае выбар месца навучання Сабескіх — Парыжскі Каралеўскі калегіум. Адказам на пытанне выбару месца навучання можа быць, па-першае, адсутнасць вялікіх грошай для навучання ў папулярных адукацыйных цэнтрах, па-другое, добрыя ўмовы для навучання ў Парыжы. Наконт гэтага мы можам прачытаць у інструкцыі, напісанай Якубам Сабескім сваім сынам. Ён піша, што “…a to dla tego że tam spokojno na ustroniu, i nie masz tak wiele Polaków i cudzoziemców, jako gdzie indziéj stoja…”, таму гэта цудоўнае месца для навучання, дзе нішто не адцягвае ўвагу ад навук [6, с. 38].

*Гісторыка-параўнальны метад* — параўнанне агульнага і асаблівага ў развіцці розных краін, народаў, падзей ці аб’ектаў, якія маюць розныя прасторава-часавыя характарыстыкі.

У межах артыкула можна зрабіць параўнанне адукацыі Якуба Сабескага ў Парыжы, які быў там у самым пачатку XVII стагоддзя, і Януша Радзівіла (1579—1620), які некаторы час навучаўся ў рыцарскай школе Парыжа ў апошнія гады XVI стагоддзя. Калі адукацыю Сабескага мы вывучаем па напісанаму ім дыярыушы, то падрабязнасці адукацыйнага падарожжа Я. Радзівіла знаходзяцца ў лістах да бацькі (Крыштафа Радзівіла «Перуна» (1547—1603)) [15], дзядькі (Мікалая Крыштофа Радзівіла «Сіроткі» (1549—1616)) [16] і стрыечнага брата (Яна Юрыя Радзвівіла (1588—1625)) [17], якія былі прааналізаваны Войцехам Сакалоўскім [14, с. 7].

З пісем Я. Радзівіла бачна, што малады магнат быў дзейным чалавекам. Яго не прываблівала вывучэнне моў, гісторыі, права і іншых навук, ён прагнуў апынуцца ў рыцарскай школе. Да ваеннай навукі Януш Радзівіл паставіўся сур’езна, нават прымаў удзел у ваенных кампаніях (удзельнічаў у аблозе Амьена (1597) і бітвах з іспанцамі падчас апошняй рэлігійнай вайны ў Францыі (1562—1598) на баку Генрыка IV) [14].

Якуб Сабескі жа, наадварот, меў спакойны характар, быў схільным да навук, у сваім дыярыушы шмат пісаў пра наведванне двара Генрыка IV, сустрэчу там з рознымі людзьмі. Падрабязна апісваў тэмы, на якія размаўлялі пры двары, знешні выгляд і паводзіны людзей. Сустрэўся там Якуб і з Янушам Радзівілам, якога назваў “człowiek humoru bardzo grzecznego i na odpowiedź prędki” [5, с. 10].

Вынікам шасцігадовага падарожжа Я. Сабескага стала азнаямленне з заканадаўствам еўрапейскіх дзяржаў, знаёмства з уплывовымі і выбітнымі людзьмі таго часу (французскія каралі Генрых IV і Людовік XIII, ангельскі кароль Якуб I Сцюарт, намеснік Нідэрландаў Морыц Аранскі, іспанскі кароль Філіп III, Папа Рымскі Павел V, імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Маціяс I, вучоныя, духоўныя асобы, палітыкі, творчыя людзі), удасканаленне валодання замежнымі мовамі. Атрыманыя веды дазволілі Якубу Сабескаму пабудаваць добрую кар’еру ў Рэчы Паспалітай і пад канец жыцця зрабіцца прыкладам дабрачыннасці, вучонасці, дыпламатычнай мудрасці. А Януш Радзівіл праявіў свой дзейны характар: удзельнічаў у вайне са Швецыяй (1600—1629), узначаліў рокаш 1606—1607 гадоў супраць Жыгімонта III Вазы, бараніў роўныя правы пратэстантаў і праваслаўных з католікам і г. д.



Репозиторий БарГУ

Зразумела, што такое параўнанне мае карысць толькі для напісання партрэтаў тых асоб, якіх параўноўваюць. Для больш грунтоўнага даследавання карысна параўноўваць больш вялікія групы людзей, напрыклад, прадстаўнікоў адной сям'і з прадстаўнікамі іншай ці адукацыйныя падарожжы ў другой палове XVI стагоддзя з падарожжамі ў другой палове XVII стагоддзя. Такія параўнанні заслугоўваюць асобнага артыкула, таму не будзем на гэтым засяроджвацца.

Сярод метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў гістарычнай навуцы, асобна вылучаюцца міждысцыплінарныя метады гістарычнага даследавання. Адным з іх з'яўляецца *кантэнт-аналіз.* Гэты метад прыйшоў у гістарычную навуку з сацыялогіі. Даследчык робіць падлік частаты з'яўлення ў тэксце пэўных характарыстык, што дазваляе зрабіць некаторыя высновы адносна намераў стваральніка дадзенага тэксту.

Мы зрабілі скарочаны варыянт аналізу і разгледзелі тое, што цікавіла нашага героя падчас падарожжа. У дыярыушы практычна нічога не напісана пра навучанне, больш апісаны вандроўкі. Таму быў праведзены пошук слоў, якія пацвярджалі б цікавасць да турыстычных аб'ектаў. Так, слова «горад» (miasto) сустракаецца часцей за ўсе астатнія — 161 раз, што не дзіўна, бо з яго пачынаюцца ўсе апісанні новых месцаў. Наступным па папулярнасці з'яўляецца слова «касцёл» (kościoł) — 141, што адпавядае важнаму месцу рэлігіі ў часы падарожжа. Далей згадваюцца «замкі» (zamek) — 17, «цытадэлі» (cytadel) — 15, «масты» (most) — 12. Пра ўнутранае ўбранства названых пабудоў практычна нічога не сказана. Можна было б палічыць і словы, якімі Я. Сабескі апісвае гэтыя архітэктурныя аб'екты, але цяжкасць у тым, что самым сустракаемым прыметнікам з'яўляецца «прыгожы» (piękny) — 175 разоў. І апісвае гэтым словам Якуб і людзей, і гарады, якія праязджае. Такім чынам, нават невялікі аналіз тэксту выявіў, што падарожнік цікавіўся разнастайнымі рэчамі, але аб'екты сакральнай архітэктуры былі найбольш цікавымі.

Метадаў, якімі можа карыстацца даследчык гісторыі адукацыйных падарожжаў шляхты і магнатаў XVI—XVIII стагоддзяў, існуе значна больш. Напрыклад, не былі асветлены такія асноўныя гістарычныя метады, як гісторыка-тыпалагічны і дыяхранічны. Не апісваліся магчымасці метадаў матэматычнай статыстыкі, дыскурс-аналізу, метады псіхагісторыі, якія карысна выкарыстоўваць пры апісанні партрэтаў гістарычных асоб ці дапаўняць імі гісторыка-генетычныя даследаванні. Не былі разгледжаны і метады паліталогіі, якія дапамагаюць пры апісанні пэўных падзей і ролі гістарычных асоб у падзеях. Але разгледжаных метадаў ужо дастаткова, каб убачыць шырокія магчымасці працы з наратыўнымі крыніцамі і складання партрэтаў гістарычных асоб.

**Заключэнне.** Сучасны стан тэарэтыка-метадалагічнай базы гістарычнай навукі прапануе даследчыку вялікі шэраг метадаў, якія дазваляюць дасягнуць мэты даследавання максімальна поўна.

Як паказана на прыкладзе адукацыі Якуба Сабескага (1591—1646) — дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, бацькі караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага, прыдатнымі для вывучэння адукацыйных падарожжаў шляхты XVI—XVIII стагоддзяў з'яўляюцца: метады лагічнага пазнання, апісальна-апавядальны, гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны метады, кантэнт-аналіз і інш.

Важна адзначыць, што ўсё больш сціраецца мяжа паміж метадалогіямі розных ізаляваных навук і ўсё больш развіваюцца міждысцыплінарныя метады, якія дазваляюць праводзіць комплексны аналіз аб'ектаў вывучэння, пераадольваючы межы традыцыйнай гістарычнай рэканструкцыі, даючы магчымасць атрымання больш поўных і грунтоўных вынікаў даследавання.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Болбас, В. С.* Канцэпцыя развіцця этыка-педагагічнай думкі Беларусі X—XVIII стст. / В. С. Болбас // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. — 2017. — № 1 (49). — С. 77—81.
2. *Сцебурака, А. М.* Развіццё адукацыі ў Беларусі ў 1569—1648 гг.: традыцыі поліканфесійнасці і сацыяльнай абумоўленасці / А. М. Сцебурака // Выш. шк. — 2009. — № 4. — С. 50—53.
3. *Самусік, А. Ф.* Дзейнасць манаскіх ордэнаў у галіне асветы на Беларусі ў першай трэці XIX стагоддзя / А. Ф. Самусік // Гісторыя: праблемы выкладання. — 1998. — № 1. — С. 37—46.
4. *Скеп'ян, А. А.* Лісты маладых князёў Алелькавічаў з Італіі / А. А. Скеп'ян // Архіварыус. Сер. «Гісторыя, архіваэнаўства, крыніцазнаўства». — 2009. — № 7. — С. 55—74.
5. *Самусік, А. Ф.* Князі Радзівілы ў пратэстанцкіх навучальных установах Еўропы ў сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст. / А. Ф. Самусік // Выш. шк. — 2017. — № 3. — С. 53—56.
6. *Sobieski, J.* Dwie podróże Jakuba Sobieskiego ojca króla Jana III. Odbyte po krajach europejskich w latach 1607—1613 i 1638 / J. Sobieski. — Poznań : Pompejusza i Spółki, 1833. — 227 s.

7. *Sobieski, J.* Instrukcya Jakuba Sobieskiego kasztelana krakowskiego, oyca króla Jana III. Dana Panu Orchowskiemu z strony synów. Z manuskryptu przedrukowana / J. Sobieski. — Warszawa : Drukarnia Narodowa J. K. Mci, 1784. — 68 s.

8. *Sobieski, J.* Instrukcya JW. JM. Pana wojewody ruskiego (Jakuba Sobieskiego oyca króla Jana III) Ichmościom Panom Synom. Do cudzych krajów jadącym / J. Sobieski. — Warszawa : Drukarnia Józefa Ungra, 1865. — 53 s.

9. *Długosz, J.* Jakub Sobieski / J. Długosz // Polski Slownik Biograficzny / Zespół redakcyjny: H. Markiewicz [i inni]. — Warszawa-Kraków, 2000. — T. XXXIX/4, zeszyt 163. — С. 483—490.

10. *Sobieski, J.* Diariusz sejmu koronacyjnego w Krakowie w 1633 roku / J. Sobieski. — Opole : Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego, 2008. — 324 s.

11. *Ковальченко, И. Д.* Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. — Изд. 2-е., доп. — М. : Наука, 2003. — 486 с.

12. Теория и методология исторической науки. Терминологический словарь / А. О. Чубарьян [и др.] ; под ред. А. О. Чубарьян. — М. : Аквилон, 2014. — 576 с.

13. Polski Grand Tour w XVIII i początkach XIX wieku : materiały z badan / Regionalna Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie ; red. A. Roćko. — Warszawa : Regionalna Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie, 2014. — 466 s.

14. *Sokołowski, W.* Studia i peregrynacje Janusza i Krzysztofa Radziwiłłów w latach 1595—1603: model edukacji syna magnackiego na przełomie XVI i XVII w. / W. Sokołowski // Rozprawy z Dziejów Oświaty. — 1992. — T. 35. — S. 3—35.

15. Аддзел рукапісаў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта (BUWil). — Ф. 3. Воп. 273. Арк. 15—16.

16. Галоўны архіў старажытных актаў г. Варшавы (AGAD). — Ф. 354. Воп. 4. Спр. 35. Арк. 507—509.

17. Галоўны архіў старажытных актаў г. Варшавы (AGAD). — Ф. 354. Воп. 4. Спр. 18. Арк. 213.

Паступіў ў рэдакцыю 25.09.2020

Репозиторий БарГУ